# Семейный клуб «Надежда» – зона психологического комфорта

***М. К. Карпович, учитель***
***начальных классов первой категории***
***Ваверской средней школы Лидского района***

*Воспитывает всё: люди, вещи, явления.*
*Но прежде всего – люди. Из них на*
*первом месте – родители и педагоги.*
*А. С. Макаренко*

Каждая семья хочет как можно лучше подготовить своего ребёнка к жизни: дать ему хорошее общее развитие, привить трудолюбие, целеустремлённость, любовь к людям и оптимизм, то есть вырастить его жизнелюбивым и жизнестойким.

Наиболее существенным фактором, влияющим на формирование личности, является семья. Это связано с тем, что основную информацию о мире и о себе ребёнок получает от родителей, которые к тому же обладают уникальной возможностью влиять на него в связи с его физической, эмоциональной и социальной зависимостью от них.

С первого дня жизни ребёнка родители начинают выполнять свой главный долг – долг воспитателей. Они стремятся к тому, чтобы их сыновья и дочери выросли всесторонне развитыми, гармонически сочетающими в себе духовное богатство, моральную чистоту и физическое совершенство. Особенно интересует родителей то, как воспитывать у детей высокие моральные качества, как вырастить их добрыми, честными, дисциплинированными.

Воспитание – дело сложное. Родители воспитывают ребят не только словом, но и делом, примером собственного поведения и деятельности, всем укладом жизни. Дети всё видят, всё замечают и вольно или невольно в одних случаях подражают родителям, в других критикуют их или игнорируют, и тогда влияние на детей оказывают другие, более авторитетные для них люди.

Родителям необходимо постоянно помнить об огромной ответственности перед обществом за судьбу своих детей. Вот почему они должны максимально подготовить себя к воспитанию ребят, изучить необходимую литературу и лучший опыт семейного воспитания. Воспитание осуществляется не только требованиями, словесными воздействиями, организацией образа жизни, но и личным примером.

Однако большинство родителей не имеет педагогического образования и потому воспитывают детей на основе не столько научных знаний, сколько интуиции и опыта своих отцов и матерей. Это часто ведёт к ошибкам, о чём родители горько сожалеют, когда видят своих детей уже взрослыми.

Необходимость развития семейно-бытовой и педагогической культуры родителей вызвана нарастающими задачами воспитания молодого

поколения, формированием внутрисемейных отношений, важностью единства действий семьи и школы.

Всегда было и будет – школа принимает от семьи эстафету в формировании личности ребёнка. Но это вовсе не означает, что семейное воспитание заканчивается с приходом малыша в школу, что при этом ослабевает роль родителей. Семья продолжает активно влиять на школьника, но теперь уже не одна, а вместе со школой. Они по-разному, с разных сторон и в разных условиях формируют душу, нравственный и духовный облик маленького человека. Но цель перед ними стоит одна, общая – воспитать гражданина, достойного человека, творческую личность.

Успех их совместных воспитательных усилий в значительной мере зависит от культуры общения, от уровня доверия друг к другу учителей и родителей, понимания ими трудностей семейного и школьного воспитания. Эффективность воспитательной работы педагога во многом зависит от его умения работать с родителями, находить с ними общий язык, опираться на их помощь и поддержку.

Принимая первоклассников, учитель становится включённым в жизнь семьи школьников. Он начинает закладывать фундамент общего развития и образования младших школьников. Психологические и физиологические особенности детей этого возраста таковы, что они требуют тесного контакта школы с родителями. К сожалению, в последние десятилетия у многих родителей сложилось мнение, что воспитание, а тем более обучение детей – это забота только школы.

Следовательно, в сложных современных условиях семье требуется систематическая и квалифицированная помощь со стороны школы. Только в процессе взаимодействия педагогов и родителей можно успешно решать проблему развития личности школьника. Необходимость организовывать работу с родителями вызвана заботой об индивидуальном развитии каждого школьника: надо, чтобы в семье ему были созданы благоприятные условия и семейное воспитание находилось в гармонии с системой школьного воспитания, чтобы воспитательные результаты школы «не стирались» семьёй, чтобы не было педагогического противостояния семьи и школы, от которого страдает в первую очередь ученик. Сотрудничество семьи и школы становится всё более актуальным и востребованным.

Для полноценного процесса обучения и формирования личности ребёнка необходим соответствующий мостик между школой и семьёй, семьёй и педагогами, педагогами и учениками, учениками и сверстниками.

Задача учителя – организация воспитательной среды, позволяющей учитывать уровень актуального развития учащегося и далее способствовать развитию его личности в процессе взаимодействия со значимым окружением – родителями, сверстниками, педагогами.

Совместная деятельность педагога и родителей – это партнёрская деятельность, направленная на гуманизацию воспитательной среды, выработку общей стратегии деятельности классного руководителя и семьи, определение направлений совместной работы, совершенствование

педагогического мастерства, культуры родителей и педагогов, освоение новых принципов жизнедеятельности и развитие новых форм общественной жизни. Главный принцип такой деятельности – глубокое уважение и вера в личность.

Большое внимание в школе уделяется проблеме повышения педагогической культуры родителей как одного из действенных путей обогащения воспитательного потенциала современной семьи. Рассматриваются пути и формы психолого-педагогического просвещения и обучения родителей, которые содействуют преодолению неуверенности в своих силах и формированию объективной оценки в качестве воспитателей, нормализуют их личную жизнь, улучшают процесс воспитания детей и защиту их прав, снижают и предупреждают негативные социальные явления в обществе.

Для установления педагогически целесообразных отношений между педагогами и родительской общественностью в нашей школе на протяжении уже нескольких лет существует клуб «Надежда». Задачи семейного клуба – учить видеть ценность и уникальность личности каждого ребёнка через родительский всеобуч, психологически направлять родителей на необходимость педагогического самообразования, на теоретическую и практическую подготовку к воспитанию детей. Цель – содействовать формированию культуры взаимоотношений в семье, воспитание осознанного отношения к охране здоровья и проявление заботы о создании экологически благополучной среды окружающей среды, а также вовлечение родителей в разные сферы деятельности школы.

Такая форма работы обеспечивает партнёрские отношения, психологический комфорт участников, взаимодоверие, творческую самореализацию взаимодействующих сторон. Членами клуба являются учащиеся начальных классов и их законные представители. Системная, последовательная работа ведёт к формированию инициативной группы родителей. При формировании группы и организации клуба прошёл опрос родителей; организована совместная деятельность, где родители получили возможность реализации творческих идей, развития педагогического потенциала; проанализирован материал по проблемам развития детей, обусловленным особенностями семейного воспитания, предложена помощь для их разрешения.

После определения программы работы клуба мы стремились к созданию условий для совместной деятельности с родителями. В процессе деятельности установились доверительные отношения, которые можно назвать неформальными. Каждый участник чувствует себя защищённым, уверенным в своей способности поддерживать и развивать опыт общения, преобразовывать собственную ситуацию жизнедеятельности.

Совместными усилиями педагогов и родителей определяются цели и задачи, разрабатывается план работы. Происходит уточнение времени реализации проекта, его содержание, осуществляется самоопределение и

добровольный выбор наиболее интересного и актуального для них вида деятельности.

Огромное значение в работе клуба придаётся рефлексии. Благодаря анализу фиксируется дистанция между заявленными проблемами и их решением, осмысливается процесс и результат работы.

При всём разнообразии и вариативности форм работы клуба важен сам подход к организации деятельности, который обусловлен партнёрским взаимодействием. Он основан на гуманистических и демократических принципах. Разнообразие возможностей для совместной деятельности и общения учителя и родителей позволяет разрабатывать формы, отвечающие частным интересам и предпочтениям каждой семьи.

## КАЛЯДКІ

**МЭТА:** узнаўленне беларускіх народных абрадаў нашых продкаў праз сумесную дзейнасць бацькоў і навучэнцаў; фарміраванне грамадзянскасці і патрыятызму.

**ЗАДАЧЫ:**

- ✓ пазнаёміць з традыцыямі правядзення народнага свята Калядаў;
- ✓ развіваць творчыя здольнасці вучняў;
- ✓ выхоўваць любоў да Радзімы, гонар за свой народ.

Правядзенню мерапрыемства папярэднічала вывучэнне таго, як і чаму праводзіцца гэты абрад. На аснове звестак распрацавалі свой сцэнарый абрада, які і правялі разам з бацькамі. Бацькі разам з дзецьмі выконвалі ролі ў пастаноўцы.

**Настаўнік.** Дарагія сябры! Сёння мы сабраліся на пасяджэнні клуба “Надзея”, каб развітацца са старым годам і сустрэць новы. У даўнія часы беларусы адзначалі надыход Новага года на працягу цэлага тыдня. Называўся ён Калядным. На гэтым тыдні адзначалася адно з галоўных свят – нараджэнне Хрыстова. Перад нараджэннем Хрыстовым, на куццю, людзі імкнуліся быць добрымі не толькі адзін да аднаго, але і да жывёл. Старэйшыя людзі нашай мясцовасці расказвалі, што ў гэтую ноч гаспадары забіралі ў хату свойскіх жывёл, каб іх абагрэць, накарміць.

Вечарамі ў хатах аднавяскоўцы сустракалі калядоўшчыкаў, хлопцаў і дзяўчат, мужчын і жанчын, прыбраных за цыганоў, якія вадзілі з сабой казу. Госці танцавалі, спявалі, гулялі ў народныя гульні, жадалі гаспадарам хаты шчасця, здароўя, добрага ўраджаю і прыбытку ў гаспадарцы. Гаспадары вельмі рады былі сустрэць калядоўшчыкаў, а за гэта ім аддзячвалі рознымі пачастункамі.

**Гучыць песня “Калядачкі”**

Запрашаем у госці к нам,

Шмат чаго пакажам вам:
Як кудзельку бабкі пралі,
Як і пелі, танцавалі,
Як вучылі працаваць –
Усё сумеем паказаць.
Запрашаем у госці к нам!

**Баба.** Дзед, падымайся хутчэй, дапамагай мне. Свята на двары. (Дзед спіць.) Дзед, а дзед, падымайся хутчэй, хутка госці прыйдуць, а ты ўсё спіш.

**Бабуля спявае песню "Ой, Калядачкі, бліны-ладачкі"**

**Баба.** Ой, заспявалася нешта, а ў печы ў мяне пагарыць усё. Не будзе чым гасцей частаваць.

**Дзед.** На кляновым лісце бабка бохан пячэ.
З печы пах прыемны даносіцца.
А ў душы маёй песня жыве,
І на волю ўсё просіцца.

**Гучыць песня "Сёння ў нашай хаце свята"**

**Дзед.** Ой, мая ж бабулька, я твой дзядулька,
Хоць жа хвалюся, за табой паганюся.

**Баба.** А ці бачыш ты мяне?

**Дзед.** Не бачу.

**Баба.** Каб то ты не бачыў за стагамі, за капамі, за вазамі, за скляпамі.

**Дзед.** А ці бачыш ты мяне?

**Баба.** Не бачу.

**Дзед.** Каб ты не бачыла за гуркамі, за гарбузамі, за капустаю, за буракамі.

**Баба.** Каб твае словы ды праўдаю сталі!

**Дзед.** Каб было шчодра на стале і ў агародзе!

**Стук у дзверы**

**Дзеці.** Добры дзень у вашу хату!

**Дачка.** Калі ласка, госцейкі, праходзьце, сядайце ды вакол сябе паглядайце.

**Баба.** Наша беларуская хата
Заселена дужа багата
Посудам драўляным,
Ручніком саматканым,
Цацкай саламянай.

**Дачка.** Вас, паважаныя, мы чакалі,
Свята без вас не пачыналі.
На нашым свяце

Не будзе часу сумаваць.
На свяце гэтым трэба
Спяваць, смяяцца, танцаваць.

**Дзед.** Мы на свята запрашаем
І сардэчна вам жадаем
Весяліцца ад душы!

**Песня “Добры вечар таму, хто ў гэтаму даму…”**

**Калядоўшчыкі.** Добры вечар таму, хто ў гэтым даму!
Нам не хочацца чакаць,
Загадайце калядаваць.

**Дачка.** Каляда чакае гасцей, заходзьце хутчэй!

**Госці.** Шчодрых, шчодрых, добры вечар!
Адкажы мне, чалавеча,
Ці есці, ці сесці,
Ці каўбасу з’есці?
Добры вечар, гаспадару!
Вынесь жа нам каўбас пару,
Вынесь сала, не скупіся,
Каб твой ячмень урадзіўся,
Каб нажалі сто коп жыта,
Каб сям’я ўся была сыта,
Каб скацінка вадзілася,
Каб пшаніца радзілася!

**Дачка**. Зараз гаспадар прынясе пачастунак, а вы можа паспяваеце?

**Лявоніха.** Добры дзень вам усім, дарагія госці,
Дзякуй, што мяне вы запрасілі ў госці.

**Дачка**. Час настаў нам паказаць,
Як умеем танцаваць.
Хай Лявоніха ўдалая
Зачаруе усіх вас.
Вельмі любім гэты танец,
Не старэе ён у нас.

**Танец “Лявоніха”**

**Баба.** Песня танца няхай льецца,
Добрай хваляй к нам нясецца.

**Песня “Полька беларуская”**
**Чуецца стук у дзверы**

**Дзед.** А хто гэта да нас яшчэ ідзе?

**Баба.** Госці ў нашу хату.

**Каза.** Добры вечар вам!
Ці рады вы нам?
**Баба.** Мы то рады, а хто вы такія?
**Каза.** Мы людзі не простыя,
З далёкага краю.
Людзі ўсе сталыя,
З-пад самага раю.
**Дзед.** Адкуль вы ідзяце?
**Гаспадар казы.** Ідзём да пана года,
Што носіць бараду шыроку,
Як лапату, сіву і калмату.
Мы к лету ідзём,
Казу вядзем, радасць нясем.
Ці шырокі сцены, каб нам патанцаваць?
Ці добра гаспадыня, каб нас пачаставаць?

**Песня "Го-го-го, каза!"**

**Баба.** На свяце ў нас прысутнічаюць цыганкі-варажбіткі. Каму пагадаюць, той долю пазнае.

**Цыганка I** (***падыходзіць да гаспадара***) Бачу, бачу, пане, што жыццёвая дарога ў вас шчаслівая. Справы добрыя чакаюць вас у казённным доме. Не зманіла, усё сказала, дабрабыт прадказала.

**Цыганка II** (***падыйшла да гаспадыні***) Хто мне тут руку пазалоціць? Праўду скажу, жыццё прадкажу. А вас бяседа вялікая чакае ў новым годзе. Гатуйцеся, спяшайцеся, ну і нас, варажбітак, не забывайце, на бяседу запрашайце.

**Інсцэніроўка "Ой, прадай мне, бабанька, бычка"**

**Баба.** Вы не бачылі майго бычка?
***Выбягае, вяртаецца з бычком. За ёй ідзе дзед. Бычок брыкаецца.***
**Дзед.** Ой, бабуля, добры дзень! Куды ж ты збіраешся?
**Баба.** Бычка прадаваць.
**Дзед.** Ой, прадай мне, бабанька, бычка.
**Баба.** (***прыпяваючы)***Ён у мяне рабы-рабы,
Усё паробіць ён для бабы.
Ён у мяне буры-буры,
Заганяе свіней, куры.
Ён у мяне лысы-лысы,
Мые лыжкі, мые міскі.
Кожны дзень дапамагае,
Тэлевізар мне ўключае.
Вось які ў мяне бычок,
Пазалочаны бачок.

Не прадам цябе нікому я!

**Дзед.** Ён цябе забадае.

**Баба.** А колькі заплаціш?

**Дзед.** Ну, колькі ёсць грошай, ды і мяне ў прыдачу.

**Баба.** Вось старгавалася, грошы атрымала, дзеда ў прыдачу, ды і бычка сабе пакіну. Вой-вой!

**Баба** (***да дзеда***). А цяпер, мой дзядок, давай паскачам, галубок.

**Дзед з бабай танцуюць польку**

**Баба.** А цяпер ідзі, дзядок, разам з бычком у хлявок.

**Дзед.** Куды?

**Баба.** У хлеў.

**Дзед.** Людзі, што гэта такое? Грошы забрала, патанцавала, ды ў хлеў з бычком адпраўляе.

***Баба штурхае дзеда з бычком. Дзед выходзіць.***

**Баба.** Не, усё ж я дзеда люблю, шкадую. Дзед, а дзед, ідзі сюды. Мой старэнькі, мой даражэнькі, пойдзем у госці. Сабірайся ў госці, мой дзядок, сабірайся ў госці, галубок!

**Дзед.** Не пайду я ў госці – холад на двары.
А мне ломіць косці, я ж ужо стары.

**Баба.** Сабірайся ў госці, мой дзядок,
Сабірайся ў госці, галубок!

**Дзед.** Не пайду я ў госці, я ж табе кажу,
Лепш на цёплай печцы паляжу.

**Баба.** Дык ляжы на печы, стары дзед,
А мяне ў госці павядзе сусед!

**Дзед.** Пачакай, Ганулька, не спяшай,
Пойдзем разам у госці, мяне не кідай!

**Дзед і баба выходзяць. Заходзяць гаспадары**

**Гаспадыня.** Дзеці, вы майго дзядулю не бачылі?

**Гаспадар**. Дзеці, бабулю маю не бачылі? Відаць, мяне не знайшла, у другі бок пайшла. Куды ж мне бегчы, каб бабулю дагнаць?

**Гаспадыня.** Дзеці, так вы не сустракалі нідзе майго дзядулю?

**Гаспадар.** Ой, бабуля, куды ж ты дзелася? Я ж табе хацеў расказаць, што аднойчы ў полі бачыў…

**Гаспадыня.** І што ты бачыў?

**Гаспадар.** Што за дзіва, што за цуд –
У рэчцы плавае вярблюд.
Есць кабыла сала, а мужык авёс.
Кабыла села ў сані, а мужык павёз.
Сядзіць кошка ў нары,
Мыш гуляе па двары.

Ды не па двары мыш завіхаецца,
А ў цябе пад кашуляй хаваецца.

**Гаспадыня.** Ратуйце, дапамажыце,
Ад звера абараніце!

***Пасля жартаў гаспадар звяртаецца да дзяцей***

**Гаспадар.** А зараз хай пакажуць хлопцы і дзяўчаты, якія прыпеўкі ведаюць.

**Гучаць прыпеўкі ў выкананні дзяцей**

**Чорт.** Хто тут танцуе? Хто тут спявае? Мяне, Чорта, пад печчу разбудзілі. У-у-у!

**Дачка.** Ты на нас, Чорт, не сярдуй. Сабраліся мы тут адпачыць. Даруй, калі разбудзілі.

**Чорт.** Добра, бачу людзі вы добрыя. Хачу я таксама з вамі пагуляць. Ёсць у мяне пад печчу лапці, давайце пагуляем.

**Гульня “Лапці”**

**Чорт.** Якія вы спрытныя, лоўкія, а я хоць Чорт і малады, мне 150 год, але я змарыўся, пайду трошкі пасплю.

**Дзеці.** А як гэтыя лапці могуць плясаць!
Ну-ка, дзеткі, усе ў круг,
Патанцуем мы не ўдвух!

**Танец “Полька беларуская”**

**Баба.** А якое ж свята без Дзеда Мароза і Снягуркі?!?

**Баба Яга.** Ха-ха-ха! Ніякага Дзеда Мароза і Снягуркі не будзе.

**Пятрушка.** Як гэта не будзе?

**Баба Яга.** А таму, што валёнкі чароўныя, валёнкі хуткаходныя, у якіх павінен прыйсці Дзед Мароз, вось яны, на мне.

**Баба яга спявае**

Вось яны, валёнкі, у Ягусі старэнькай!
Дзед мароз вас не знайдзе, і на свята не прыйдзе.
Валёнкі, валёнкі, чароўныя валёнкі!

**Баба Яга.** Не будзе ніякага свята. Збірайцеся па хатах, разбягайцеся!

**Пятрушка.** Э, чаго прыдумала. Усе сабраліся, чакаюць свята, а якое свята без дзеда мароза? Аддавай валёнкі. (***Баба Яга дуе на яго, і ён падае)***

**Баба Яга.** Вось так!!!

**Пятрушка.** Баба Яга, аддай валёнкі!

**Баба Яга.** Выканайце маё заданне. Зможаце для мяне модны танец станцаваць?

**Пятрушка.** Які?

**Баба Яга.** Ну, я забылася як ён называецца… Ну вось такі… Ну, такі, курыны танец. Не-а, гусіны. А-а-а, успомніла, качыны!!!

**Пятрушка.** Дзеці, пакажам?

**Танец маленьких утят**

**Пятрушка.** Ну як, спадабалася? Аддавай валёнкі!

**Баба Яга.** Спадабалася, ды не вельмі. Так усе могуць. А вы мне лепш песню паспявайце, тады і валёнкі будуць вашы.

**Пятрушка.** А сама ты спяваць умееш?

**Баба Яга.** О, я самая лепшая ў свеце спявачка.

**Гучаць прыпеўкі Бабы Ягі**

**Баба Яга.** Але гэта яшчэ не ўсё. Апошняе заданне. Пагуляйце са мной у гульню "Правільна – няправільна"

- Дзед Мароз вядомы ўсім?
- Так!
- Ён прыходзіць роўна ў 7?
- Так!
- Дзед мароз харошы?
- Так!
- Носіць футра і галёшы?
- Не!
- Дзед Мароз баіцца сцюжы?
- Не!
- Са Снягуркай ён дружыць?
- Так!
- Вы на свята к нам прыйшлі, боты ў сумках прынеслі?
- Не!
- Хутка Дзед Мароз прыйдзе, падарункі прынясе?
- Так!

**Пятрушка.** Усё, бабулька. Аддай, калі ласка, валёнкі.

***Баба Яга плача***

**Пятрушка.** Што з табою, Баба Яга? Чаму ты плачаш?

**Баба Яга.** Ад радасці. Трыста год жыву, слова добрага не чула. Усё Баба ды Яга… Дзеці дражняцца "Ёжка – касцяная ножка". А вы так ветліва,

бабулька, калі ласка… Вось вам валёнкі, занясіце іх Дзеду Марозу, а я ў лес пайду, брыдка мне, што вам хацела свята сапсаваць.

**Пятрушка.** А я панясу Дзеду Марозу валёнкі, каб ён прыйшоў да нас на свята.

**Гучыць песня "Навагодні карагод"**
**З'яўляецца Снягурка**

**Снягурка.** Сёння я прыйшла адна, а Дзед Мароз прыйдзе пазней. Рыхтуйце вершы, песні, карагоды, каб весела сустрэць Дзеда Мароза. Я жадаю вам поспехаў у вучобе, быць заўсёды спрытнымі, умелымі і дужымі. Вясёлых Калядаў вам, сябры!

**Каза.** Трэба нам ужо ў дарогу,
Дзякуй, госці, за падмогу.
Вы так дружна памагалі,
Нас так хораша віталі!

**Гаспадар Казы.** І шкада, а ўсё ж бывайце!
Толькі нас не забывайце!

**Цыганка I.** Надыходзіць сумны час –
Нам пара растацца.

**Цыганка II.** Але просім шчыра вас
Нас не забывацца.

**Баба.** Вельмі рады мы гасцям
Іх частуем ласкай.

**Дзед.** Няхай сонца свеціць вам,
Як у добрай казцы.

**Песня "Бывайце здаровы!"**